Наша доля

Рэспубліканская штотыднёвая газета
Выдаецца з верасня 1990 г.

№ 22 (131)
2 чэрвеня 1994 г.
Кошт у розніцу — 200 руб.

У нумары:

Обращение Международной организации инвалидов к участникам второй сессии Подготовительного комитета Всемирной встречи на высшем уровне по социальному развитию

Если колониализм и диктатура нам что-то и дали, так это понимание того, что процветание, продуктивность, равенство не могут быть навязаны авторитарным путем.

Если народ не принимает участия полностью демократическим способом в формировании и выполнении своих собственных решений, то решений не будет никаких.

Мы, представители международных организаций, объединяющих инвалидов, обращаемся с просьбой привлечь нас к работе на самом высоком неправительственном уровне по планированию работы Встречи на высшем уровне по социальному развитию, по подготовке ее рекомендаций путем участия в дискуссиях и выполнения ее решений.

Мы предлагаем сформировать экспертную группу для подготовки проекта рекомендаций для инвалидов. Более 50 % членов этой группы должно состоять из инвалидов, назначенных неправительственными организациями, объединяющими инвалидов.

Коллеги, существует представление, что люди с нарушениями здоровья составляют небольшую группу со своими специфическими интересами, обусловленными их печальной участью, со своими неразрешимыми проблемами, со своими неисполнимыми запросами, не свойственными обыкновенным людям.

Это вредные, не соответствующие действительности заблуждения. В связи с развитием современной медицины и социальных услуг в XX столетии все возрастающее количество человеческих существ, насчитывающих многие миллионы, выживает в условиях, которые прежде были для них фатальными, и продолжает жить со значительными нарушениями здоровья.

По оценкам ВОЗ, в мире имеется 500 миллионов инвалидов. По нашим исследованиям и оценкам, их число вдвое больше и продолжает быстро расти.

Если в настоящее время в вашей семье нет лиц с нарушением здоровья, они будут. Это будет ваша мать, ваш брат, ваша жена, ваш сын. Это будете вы. Это случится. И это не должно быть трагедией. Это может быть торжеством счастливой жизни над зависимостью и смертью.

Солидные научные свидетельства, накопившиеся в течение столетия, неопровержимо доказывают, что лица с любым типом нарушения здоровья могут быть плодотворными работниками в качестве исполнителя или руководителя в любой сфере человеческой деятельности, если им предоставить возможность обеспечить развитие своих потенциальных способностей. Таким человеком был один из основателей этой организации Франклин Рузвельт.

Но наши мужественные попытки развивать эти изумительные способности постоянно наталкиваются на тяжелое наследие старых предрассудков и анахронического авторитаризма.

Более миллиарда человек с нарушением здоровья являются основными жертвами всех социальных проблем, которые будут рассмотрены на Встрече на высшем уровне. Мы — несчастнейшие из несчастных, получающие меньшее образование, чем все остальные. Мы — бездомные, безработные. Мы — неравноправны, заключенные в тюрьму, жертвы войны — беженцы. Мы —умирающие, покинутые старики, угнетенные женщины. Нам в последнюю очередь достаются пища и медицинский уход. Мы умираем в первую очередь.

Нарушение здоровья стало обычным состоянием человеческого существа. Если рекомендации этой Встречи не коснутся лиц с нарушением здоровья, они не коснутся никого.

Мы, имеющие нарушение здоровья, аплодируем обещанию председателя, что эта Встреча на высшем уровне не только подтвердит статус-кво, но и обсудит проблемы тех, кто еще ведет борьбу, пытаясь разорвать связывающие их цепи.

Мы аплодируем предпринятым прежде попыткам ООН способствовать облегчению участи инвалидов — объявить Международный год инвалидов, Десятилетие инвалидов, принять декларации, признающие наши права человека.

Мы аплодируем словам Генерального секретаря, признавшего при открытии этой Встречи, что решения в социальной сфере могут быть приняты только, если заинтересованные лица примут активное участие в этом процессе.

Мы аплодируем всему вышесказанному, но вместе с тем мы с почтением сообщаем вам, что мы, представляющие наиболее бесправных в мире людей, не были серьезно привлечены к участию в работе этой организации. Чудесные слова, высказанные в ООН, не получили практического воплощения.

Мы были терпеливы. Мы были вежливы. Больше мы не будем молчать в мрачной тюрьме нашего почти животного прозябания.

Коллеги, давайте нарушим условности, предрассудки и авторитаризм. Давайте объединимся, люди с нарушением и без нарушения здоровья, члены правительства и простые граждане.

Давайте объединимся в духе Ганди, Манделы и Мартина Лютера Кинга. Давайте действовать с любовью, разумно, твердо соблюдая принципы равенства, самоопределения и божественности человеческой жизни.

Жизни, которые мы украсим, будут жизнями наших собственных детей.

ІДЗЕ ПАДПІСКА

У шчасці, у бядзе, нядолі — заўсёды з вамі "Наша доля"

Ва ўсіх аддзяленнях сувязі і прадпрыемствах "Саюздруку" ідзе падпіска на штотыднёвік "Наша доля" на трэці квартал 1994 года. Падпісная цана на тры месяцы — 3000 рублёў. Заставайцеся з намі! Падпіска працягнецца толькі да 15 чэрвеня.

Помогли спонсоры

Организованно провело подписку на газету "Наша доля" на третий квартал общество инвалидов Советского района г. Минска. Печатный орган Центрального совета БелОИ будут получать более трехсот человек. Среди них — участницы Великой Отечественной войны М. А. Гудыря, инвалиды 1-й группы И. И. Иванова, А. У. Пушкин, С. Ф. Максимчик и другие.

Много и плодотворно поработали в период подписной кампании председатель районного ОИ А. А. Закреавский, инструктор Т. В. Бигель, а также диспетчеры А. А. Антух, В. И. Заливако, О. В. Драгун, Л. И. Авсиевич, Л. Н. Хальчицкая.

— "Нашу долю" мы выписали за счет средств своей организации, — сказал А. А. Закревский, — кроме того, за счет спонсорских вкладов многие инвалиды будут получать газеты "Республика" и "Вечерний Минск". Немалая заслуга в этом М. Е. Менакера, сумевшего договориться более чем с десятью коммерческо-производственными и другими фирмами о выделении средств для ОИ Советского района на подписку газет. Наиболее значительные суммы перечислили Белорусский республиканский центр дедективных служб "Мэта" (директор Ю. В. Лаврушук) — 1 миллион руб., коммерческая фирма "Лював" (директор В. М. Чеменев) — 900 тыс. руб., общество с ограниченной ответственностью "Сервид" (директор С. Н. Будник) — 200 тыс. руб.

Д. Писляков

АБОНЕМЕНТ на газету **63866** (индекс издания)

«Наша доля»
(наименование издания) | Количество комплектов

на 199___ по месяцам:

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куда ______ (почтовый индекс) ______ (адрес)

Кому ______ (фамилия, инициалы)

ДОСТАВОЧНАЯ КАРТОЧКА

ПВ | место | литер

на газету **63866** (индекс издания)

«Наша доля»
(наименование издания)

Стоимость	подписки	___ руб. ___ коп.	Количество комплектов
	переадресовки	___ руб. ___ коп.	

на 199___ по месяцам:

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куда ______ (почтовый индекс) ______ (адрес)

Кому ______ (фамилия, инициалы)

Добра, калі цябе любяць

"Нарадзілася я калекам — з перакошанымі целам, рукамі, нагамі. Адзінае, чаго не крануў дзіцячы царабральны параліч — дык гэта твару. Добра памятаю сваё дзяцінства. Хаця наўрад ці можна назваць дзяцінствам праведзеныя ў каморцы доўгія пакутлівыя дні і ночы, калі ад голаду не трымалася галава, калі нельга было зыбыцца ў сне ад матчыных п'яных крыкаў і тумакоў. Адзінае, што было светлым — дык гэта бабуля. Як не было дома маці, яна прыходзіла памяняць бялізну, іншы раз выносіла мяне на вуліцу. Напэўна, каб бабуля засталася жыць, са мной нічога б такога не здарылася.

Маці цвярозай я амаль ніколі не бачыла. Піла яна па-чорнаму. Вадзіла да дому і мужчын, такіх, як сама — алкашоў. Сорамна пісаць пра тое, што яны п'яныя тварылі кожную ноч. Гэта былі самыя жудасныя часы. Не раз мне хацелася падпаўзці да акна і выкінуцца з чацвёртага паверха, каб ніколі не бачыць гэтага бруднага застолля, не чуць п'янай лаянкі. Але ўсякі раз мяне нешта стрымлівала. Што? Я зразумела гэта пазней.

У тую ноч маці прывяла дадому яшчэ зусім маладога хлопца, бадай што майго равесніка. Прапітай, ёй хапіла некалькі кілішкаў, каб зваліцца з ног. Сабутыльнік жа пачаў шнырыць па пакою ў пошуках спіртнога. Калі ўсё ў ім абшукаў, зазірнуў у каморку. І тут убачыў мяне. Памятаю яго набеглыя крывёй вочы, звярыны выскал. Ён доўга не думаў. Схапіў мяне ў ахапку і тут жа, на падлозе, згвалтаваў. Я не крычала, не супраціўлялася. У думках даўно падрыхтавала сябе да гэтага. Марыць аб чыстым, светлым каханні проста не магла. Каму патрэбны калека?!

Зараз я чакаю дзіця. Не ведаю, як буду далей жыць з ім. Таго хлопца я больш не бачыла. Напэўна, баіцца заходзіць. Хаця я на яго і не злосная."

Вось такое пісьмо атрымала рэдакцыя — без зваротнага адрасу. Адно на прыканцы: Валя. Праўда, на канверце — Гомельскі паштовы штэмпель. Я доўга вагалася, перш чым вырашыць: друкаваць ананімны гэты ліст ці не.

Занадта ўжо далікатная і балючая гэта тэма. Здаецца, надышоў той час, калі да інвалідаў здаровае грамадства павярнулася, як кажуць, тварам. Створаны і дзейнічаюць праграмы комплекснай рэабілітацыі і дапамогі, прыняты законы сацыяльнай абароны з шэрагам ільгот. Аб усім гэтым так часта і так моцна гавораць па радыё, тэлебачанні, пішуць у газетах. Можа і дапамогі той — кот наплакаў, але ж галоўнае — размах, узровень. Ці не таму, калі мы гаворым "інвалід" — падразумяваем нешта жаласнае, бездапаможнае, гаротнае. Стварылі гэтакі комплекс непаўнацэннасці. Сам інвалід парушыць яго не ў сілах. Інвалід таксама чалавек з закладзенымі прыродай інстынктам і патрэбамі, дапамагчы рэалізаваць якія і павінна наша грамадства.

Мы ж на гэтую праблему закрываем вочы. А яна існуе, і існуе востра. Добра, калі цябе любяць. А што рабіць дзесяткам, сотням, тысячам скалечаных хваробай, няшчасным выпадкам людзей? Ніхто з іх не марыць аб "Пунцовых ветразях", і ўсё ж яны хочуць адчуваць сябе мужчынам, жанчынай. Рэдка хто з інвалідаў у нас мае асобную кватэру, нават пакой. Тыя ж, на ўтрыманні каго знаходзяцца хворыя, ствараць большменш нармальныя ўмовы ім нават і не думаюць. Ці то не разумеюць, ці то не хочуць. Вось і даводзіцца многім з іх чакаць таго "шчаслівага" моманту, калі цябе ў лепшым выпадку проста згвалтуюць з чыста звярынага інстынкту.

Некаторыя ў пошуках кахання стараюцца любым чынам пазбавіцца сваіх чатырох сцен. Уладкоўваюцца ў інтэрнаты. Падпольнае інтымнае жыццё там удаецца не кожнаму: у пакоі — па некалькі чалавек, калі і знаходзіцца партнёр, дык хавацца з ім трэба ў ваннай, падсобках. І сорамна, і брыдка.

Нейк па тэлебачанні даводзілася бачыць дакументальны фільм аб тым, як праблемы інтымнай блізкасці паміж інвалідамі вырашаюцца ў Амерыцы. Канечне, нам да гэтага яшчэ ой як далёка. І ўсё ж пры жаданні сёе-тое можна зрабіць. Хаця б арганізаваць продаж у спецыялізаваны краме розных інтымных прылад, ну, напрыклад, жаночы ці мужчынскі манекен, штучныя чалавечыя часткі цела і шмат чаго яшчэ. Дарэчы, у Маскве такі магазін працуе. Можна арганізаваць і нешта падобнае на гасцініцу для інвалідаў з асобнымі пакоямі за невысокую плату.

І галоўнае — не трэба баяцца пісаць і гаварыць аб гэтым. Думаем, што на пісьмо Валянціны, якая ўзняла ў ім праблему кахання, інтымнага жыцця, адгукнуцца многія. У наступных нумарах мяркуем прадоўжыць распачатую тэму.

Ж. Уласава

Мікола Капыловіч

Бацькавы вочы

Дзверы майго пакоя ў саўгаснай гасцініцы адчыніліся, і ціха з вядром у руцэ ўвайшла прыбіральшчыца — цётка Мар'я:

— Не патурбую, калі трохі ў вас прыбяру?

Я моўчкі кіўнуў галавою.

У гэты час на невялікай вясковай плошчы — цвінтары (яна была прама пад вокнамі) паявіўся вясельны гурт людзей. Спыніўся каля помніка загінуўшым воінам. Маладыя паклалі да падножка кветкі. Да іх з шырокім ручніком праз плячо падышоў шафер і працягнуў жаніху рыдлёўку, а нявесцы — саджанец ліпы. Усе накіраваліся ў саўгасны парк, дзе маладыя саджаюць дрэвы — на доўгае каханне і шчасце.

— У гэтым парку і майго Алеся ліпа расце, — сказала цётка Мар'я. — Ужо вялікая. Да верхавіны рукой не дацягнешся.

Яна села на табурэт, паклала на калені рукі і працягвала:

— Адзін ён у мяне. Я ж, даражэнькі, не тутэйшая. Вайна мяне сюды закінула. Адступалі, сам ведаеш, ад самай граніцы. Усяго нацярпеліся, схапілі гора. І бамбілі нас фашысты паганыя, і з кулямётаў стралялі. Думала, заб'юць... Але неяк уцалела.

Калі перайшлі Дняпро, чуем нападзе стрэлы. Гэта немцы дарогу перарэзалі. Звярнулі з бальшака — і ў лес. Адчуваю, што далей не магу ісці: ногі апухлі, галава ад голаду кружыцца. Адстала ад сваіх. Выбрала гусцейшую ёлку і пад ёю пачала рыхтавацца на начлег. Але сон не браў: на дарозе нямецкія танкі грымяць, і мне здаецца, што фашысты мяне акружаюць. Нейк намацала сушэйшае месца, нарвала папаратніку, разаслала яго пад бок і ўмасцілася на нач. Заплюшчыла вочы і раптам чую трэск галля, нехта ідзе да мяне. Затаілася я, ну, думаю, смерць мяне знайшла! Гляджу, скрозь кусты прабіраецца бабулька — гарбаценькая, з кашалём за спінаю. Падышла да мяне і пытае: "Адкуль, галубка, будзеш?" Потым, быццам спахапіўшыся, дастала з кашаля хустку, пачала яе развязваць. "Еш!". І працягвае мне дзве вялікія картопліны, свежы агурок і акраец хлеба. Усё гэта мне здалося смачнейшым за мёд. "Вось і добра, — ласкава сказала бабулька, — трохі адпачнем, а потым пойдзем". Да змярку лясная дарога прывяла нас у невялічкую вёску. Хата маёй выратавальніцы стаяла на беразе маленькай рэчкі.

Завяла мяне гаспадыня ў хату, пасадзіла на шырокую лаву, а сама пайшла паліць у печы. А я пачала разглядваць у рамцы на сцяне картачкі, некаторыя з іх ад часу ўжо выцвілі. Усярэдзіне мужчына — па вачах не стары, а барада ляжыць на грудзях, нібы лапата; па адзін і другі бок — зусім маладыя хлопцы, прыгожыя, статныя. Хутка я даведалася, што барадаты быў мужам гаспадыні, а хлопцы — сынамі. Усе трое пайшлі на вайну. А Хвядора Варламаўна з сабакаю Шпулькаю дома засталіся. Фашысты іх не трывожылі, яны ў маленькія вёсачкі рэдка заязджалі — партызанаў, няйначай, баяліся. Нейк увечары сядзім на прызбе, прыходзіць суседка.

— Не чулі, — кажа, — на Лук'янаўскім шляху партызаны паліцаяў пастралялі.

Раз'юшыліся немцы. Пачалі хапаць усіх, хто трапіцца на вочы. Плач, стогн, слёзы, крыкі... Там, дзе быў хлеў, пачуліся стрэлы. Я асцярожна выйшла на ганак хаты: цішыня, цемень. І раптам я пачула, што недзе захныкала дзіця. Спачатку ціха заплакала, потым перайшла на надрыўны крык. Мне жах ахапіў. Вярнулася ў хату, кажу Хвядоры Варламаўне: "Пайду, гляну".

Дзе сагнуўшыся, дзе паўзком падабралася я да хлява. Зазірнула ў яго — няма нікога. А дзіцятка, якое ў гэты час маўчала, зноў заплакала. Прыслухалася — з глыбокай сіласнай ямы плача. Папаўзла туды. Дно ямы было завалена мерцвякамі. А з самага краю ляжыць мёртвая жанчына, а на яе грудзях поўзае дзіця. Я хуценька схапіла яго на рукі і — дамоў, у хату. Запалілі мы з Хвядораю капцілку, укуталі малога ў цёплае. Хлопчыкам сірацінка аказаўся. На правай ножцы ніжэй калена запяклася кроў — куля навылёт прайшла. Змазалі рану, перавязалі белай анучкай, хлопчыка трохі падкармілі... І заснуў бедненькі. Хвядора Варламаўна кажа: "Вось, Марыля, і табе сынок знайшоўся". А ён і праўда, як мая крывінка. Хутка ён прачнуўся, абцёр кулачкамі нос і ўсміхнуўся мне светлай усмешкаю. Узяла яго на рукі і заплакала — так шкада яго стала. Прыціснула яго да грудзей ды кажу: "Бацькавы ў цябе вочы, Алеська". Так гэта імя за ім і засталося.

— А колькі гадоў было хлапчаняці? — пацікавіўся я.

— Месяцаў дзесяць — адзінаццаць, — адказала цётка Мар'я. — Выхоўваць яго мне ўсе вяскоўцы дапамагалі. Раніцай, глядзіш, пад дзвярыма вядро з морквою стаіць, а хто прынёс — не ведаеш. Паліцаі дапытваліся не раз, адкуль у мяне дзіця. Дзякуй ім, ніхто не сказаў.

Дачакаліся мы вызвалення. Я стала працаваць на ферме даяркаю. Прыносіла сыну малако, адхоўвала яго ад галадухі. Рос ён разумным хлопцам. А Хвядора Варламаўна, бывала, кажа: "Прыйдзе, Марыля, мой малодшы Хведзька з фронту, пажэніцеся"... Так яна і не дачакалася сваіх мужчын. Іх імёны — на тым помніку.

Яна падышла да акна і пачала моўчкі глядзець на помнік, які стаяў цераз вуліцу. У гэты час з-за павароткі паказалася вясельная працэсія. Маладыя, пасадзіўшы ліпку ў парку, ішлі ў дом жаніха.

— Цётка Мар'я, — спытаў я, — а чаму вы лічыце, што ў вашага Алеся бацькавы вочы?

Яна зноў села на табурэт і ўсміхнулася:

— Яшчэ дзяўчынкаю ўбіла сабе ў галаву, што выйду замуж за таго хлопца, у якога блакітныя вочы і імя Яўсей.

— Дык цяперашні дырэктар саўгаса Аляксандр Яўсеевіч — ваш сын? — здагадаўся я.

— Мой, Алеська, — адказала прыбіральшчыца, схапіла вядро і выйшла з пакоя.

Актуальна!

Канстытуцыя прынята. Што далей?

Нельга абвінавачваць Вярхоўны Савет Беларусі ў тым, што ён стварыў Канстытуцыю рэспублікі так-сяк накасяк. Аж два з паловай гады дыскутавалі дэпутаты. Ішлі бясконцыя дэбаты вакол кожнага артыкула, нават кожнага слова. Часам здавалася, што праект Асноўнага Закона так і застанецца праектам; раззлаваныя парламентарыі кінуць яго ў кошык і больш не возьмуцца за дапрацоўку.

"Трэба ратаваць эканоміку! — крычалі некаторыя. — Цяпер не да Канстытуцыі!" І ў нейкай ступені мелі рацыю. Але новы спікер знайшоў у сябе сілы, каб давесці пачатую яго папярэднікам справу да пераможнага канца.

Канстытуцыя прынята. Ды толькі набалелыя праблемы не зніклі, а, наадварот, з кожным днём набываюць больш востры характар, іх цяпер хоць адбаўляй.

З кожным днём усе даражэе. Толькі не чалавек. Ён вельмі танны. З ім ніхто не лічыцца. Дабрыня ў адносінах да яго нагадвае ўспышку рэкламных агнёў, а ў большасці выпадкаў — прытворная.

Між тым, новая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь абвяшчае чалавека найважнейшай каштоўнасцю. З апісання яго правоў нават пачынаецца Асноўны Закон. Хочацца верыць, але калі гэта будзе!

Калі на поўныя абароты запрацуе Канстытуцыя? Пытанні, пытанні... Мы нават не ведаем, якое грамадства збіраемся будаваць. Быццам бы прававое, дэмакратычнае, сацыяльна зарыентаванае. Добра было б, каб гэтыя дэкларацыі аб намерах здзейсніліся.

А вось яшчэ пытанне, адказу на якое не знойдзеш у новай Канстытуцыі: чым мы займаліся пасля кастрычніка 17-га года? Няўжо больш за 70 гадоў прайшлі марна? Але ж, нягледзячы на ўсе цяжкасці і перакосы, штосьці стваралі, і матэрыяльнае, і духоўнае. Дыялектыка вучыць, што ні ў якім разе нельга поўнасцю адмаўляцца ад мінулага, усё лепшае з яго трэба браць на карысць дня сённяшняга.

Зараз хадавым стаў тэрмін "посткамуністычнае грамадства". Мне здаецца, ён надуманы. Гаворка можа ісці аб урастанні капіталізму ў сацыялізм, ці наадварот. Ніякай сапраўднай камуністычнай фармацыі мы не стварылі. Больш за паўстагоддзя жылі пры адміністрацыйна-каманднай сістэме, якую называлі сацыялізмам; з фальшывымі, апошленымі наменклатурай лозунгамі хадзілі на дэманстрацыі; паспешліва прысвойвалі вуліцам назву "камуністычная"... Цяпер за гэтыя падманы трэба разлічвацца.

Вялікі ідэал, за які адны змагаліся, а другія клікалі змагацца, знаходзіцца ў рэанімацыі. Колькі яго будуць там трымаць, невядома. І ўсё ж хочацца верыць, што пасля цяжкай хваробы да яго паставяцца больш сумленна і творча, не возьмуць яго на ўзбраенне вульгарныя блізарукія спекулянты ад палітыкі.

Многія мае суайчыннікі сёння, пасля ўвядзення пасады прэзідэнта, не без іроніі разважаюць: "Учора быў ЦК, заўтра будзе прэзідэнт. Не кіем, дык палкай". Зазначу, аднак, што Цэнтральны Камітэт існаваў усё ж у асноўным за кошт партыйных узносаў, а прэзідэнта і яго каманду павінен утрымліваць увесь народ. Толькі прэзідэнцкія выбары абыйдуцца амаль у 120 мільярдаў рублёў. Гэта значная доля гадавога бюджэту нашай вобласці, напрыклад. За такія грошы можна знайсці кандыдата ў прэзідэнты з розумам Сакрата. А калі не знойдзем? Выбары могуць аказацца проста чарговай палітычнай гульнёй, чаго не даруе народ.

Але лідэры не паяўляюцца на палітычным гарызонце аўтаматычна. Адно выйсце — шукаць іх трэба калектыўным розумам, пераадольваючы непамерныя амбіцыі членаў асобных партый, аб'яднанняў, груповак. Ці хопіць настойлівасці і мудрасці, каб па-сапраўднаму дружна ўзяцца за адзін гуж?..

Крычым аб аб'яднанні здаровых сіл. А на справе ўсё наадварот. Расколваецца нават ветэранская арганізацыя, якая ўвесь час выступала за адзінства і пераемнасць пакаленняў. Зараз ад яе аддзяляецца плынь пад назвай "Дэмакратычнае згуртаванне".

Хутка, зусім хутка будзем мы з вамі, шаноўныя землякі, выбіраць першага беларускага прэзідэнта. Ці не занадта хутка? Канстытуцыю два з паловай гады рыхтавалі, а прэзідэнта хочам за два месяцы абраць. Нічога не скажаш, сціслыя тэрміны. Але нам не прывыкаць выконваць пяцігадовыя планы за тры гады. Ніколькі не збянтэжыла народных дэпутатаў, якія прымалі Закон аб прэзідэнцкіх выбарах, тая акалічнасць, што такія выбары не маюць у нашай гісторыі прэцэдэнту, а, значыцца, і вопыту іх правядзення няма. І яшчэ: ну, нябачна пакуль на нашым палітычным небасхіле бясспрэчнага народнага лідэра.

Адзіны прывілеяваны клас — так мы называлі дзяцей у гады сталінскага дэспатызму, у перыяд хрушчоўскай адлігі і брэжнеўскага застою. А зараз усё часцей задумваемся, што чакае іх заўтра і ў больш аддаленым будучым? Шалёнымі тэмпамі растуць цэны не толькі на дзіцячыя адзенне і абутак, на ласункі — раней даступныя практычна кожнаму. А духоўны спажытак. Гляну, колькі каштуе кніжка для дзяцей — цёмна ўваччу робіцца. Недасягальнымі сталі цацкі. Ну ці не вар'яцтва гэта: 50—80 тысяч рублёў за машынку, лялькy?!

Апошнім часам у вобласці зачынілі свае дзверы для дзяцей 80 садкоў. Частка іх прададзена камерцыйным структурам. Няма сродкаў на ўтрыманне аздараўленчых лагераў. Можа, зменшылася колькасць дзіцячых захворванняў? Не, яна ўзрастае. Вось што, напрыклад, сказала на нядаўняй сесіі Брэсцкага абласнога Савета народных дэпутатаў загадчык аддзела адукацыі Столінскага райвыканкама А. М. Калодзій: "У большасці тых дзяцей, якія нараджаюцца, урачы выяўляюць прыроджаную паталогію. З рознымі захворваннямі на дыспансерным уліку цяпер 35 працэнтаў нашых школьнікаў. Паўплывала на здароўе дзяцей і паводка. Усе мы і нашы дзеці п'ем вельмі дрэнную ваду. У цяперашняй экалагічнай сітуацыі разлічваць на нармальную ваду для піцця не даводзіцца. Аздараўленчая кампанія на месцы эфекту не дае. Нашых дзяцей хаця б двойчы ў месяц трэба вывозіць у чыстыя ад радыёнуклідаў месцы і карміць чыстымі прадуктамі. Абследаваць своечасова ў раённай бальніцы нашу дзятву не маем магчымасці. Хваробы запускаюцца".

Дададзім: падобная абстаноўка і ў іншых раёнах, асобных населеных пунктах, дзе пакінула свой каварны след чарнобыльскае ліха. Вялікай застаецца і дзіцячая інваліднасць. А ці многа мы робім для гэтых маленькіх гаротнікаў? Ці, можа, спадзяёмся, што Германія і іншыя заможныя краіны будуць аздараўліваць іх штогод?

У застойныя гады мы любілі крытыкаваць Злучаныя Штаты Амерыкі, дзе мала ўдзялялася ўвагі падрастаючаму пакаленню. Цытавалі, у прыватнасці, прафесара Калумбійскага ўніверсітэта Пола Гудмена, які ў кнізе "Маладое пакаленне расце бязглуздым" пісаў: "Мы знаходзім дзікія супярэчнасці паміж тым, што нам гавораць пра Амерыку і тым, што мы адкрываем; між тым, чаго мы жадаем, і тым, чаго не можам дасягнуць. Наша грамадства не можа даць усім працу. Яно замінае праяўленню здольнасцей і спараджае глупства. Яно разбэшчвае шчыры патрыятызм. Яно разбурае выяўленне мастацтва. Яно заціскае навуку. Яно ахалоджвае жыццярадасны пыл... Яно не мае сумлення... Маладыя людзі, якія прызвычайваюцца да пануючай сістэмы, у большасці выпадкаў становяцца апатычнымі, цынічнымі і спустошанымі. У нашым грамадстве здольныя, жыццярадасныя дзеці ператвараюцца ў цынічных двуногіх жывёл, што не прыносяць карысці".

Зараз мы перасталі ганьбіць Амерыку, а прыведзеныя словы можам цалкам аднесці да лёсу дзяцей нашай краіны.

Што мы перададзім сваім нашчадкам у спадчыну? Голы тэкст новай Канстытуцыі, без здзейсненых мараў? А можа, пакладзем гэты тэкст у капсулу і замуруем у Курган Славы? Вопыт такі маем. Пасылалі ж розныя звароты ў камуністычнае будучае. Наша юная змена хоча ўбачыць фасад сапраўднай дэмакратычнай, сацыяльна-прававой дзяржавы. Толькі ці пабудуем яе? Маладое пакаленне можа хоць спадзявацца. А на што разлічваць пенсіянерам, інвалідам?

Неаднойчы аўтару гэтых радкоў даводзілася бываць у абласным аддзяленні таварыства інвалідаў, гутарыць там па шчырасці пра жыццё-быццё з такімі ж абяздоленымі. Інваліды часта жартуюць, маўляў, нам не трэба берагчы страўнік ад тлустай каларыйнай ежы, бо ў нас не толькі напярэдадні Вялікадня, амаль штодня — Вялікі пост.

Даўно "з'едзены" ўсе запасы (і не толькі прадуктаў харчавання), знасіліся вопратка, абутак, іх не набудзеш цяпер за мізэрную пенсію. Трэба сапсаваць многа крыві, каб адрамантаваць тэлевізар, халадзільнік, не кажу пра кошт бытавых паслуг. Многа папрокаў давялося чуць ад інвалідаў у адрас Вярхоўнага Савета, які выказаўся супраць вылучэння кандыдатаў у дэпутаты ад інвалідскай арганізацыі.

Што да лекаў, дык цяпер інваліду вельмі цяжка набываць іх па ільготных рэцэптах. Ды і выпісваюцца апошнія дактарамі пасля доўгіх ваганняў. Цэны на некаторыя імпартныя лякарствы пераваліл за сотню тысяч рублёў, а танных айчынных замяняльнікаў няма. Адным словам, інвалід заўжды стаіць перад праблемай выбару, што купіць за сваю жабрацкую пенсію — лекі, хлеб надзённы, а, можа, газеты выпісаць?

Мы шмат сёння разважаем пра міласэрнасць. Вялікі дзякуй ініцыятарам гэтага руху. Але, на жаль, ён не стаў яшчэ масавым. Міласэрнасць часта мінае прытулак інваліда. Ох, як цяжка калеку, калі разбіваюцца апошнія яго надзеі! Некалі вядомы аўстрыйскі пісьменнік Стэфан Цвейг пісаў: "Ні адзін доктар не ведае такіх лекаў для стомленага цела і змучанай душы, як надзея". Гавораць, надзея памірае апошняй. Бяда, што ўсяліць яе ў душу абяздоленага лёсам чалавека часцей за ўсё няма каму.

Раней інвалідаў з працягнутай рукой можна было бачыць толькі каля царквы. Зараз стаяць усюды, асабліва каля гандлёвых кропак. Ды толькі мала хто звяртае на іх увагу, цураюцца іх часам і ўладальнікі камерцыйных ларкоў. Мне часта ўспамінаюцца словы, сказаныя падчас адной з нашых шматлікіх гутарак з інструктарам абласнога аддзялення таварыства інвалідаў Васілём Фёдаравічам Сатнічэнкам: "Толькі ў нашай вобласці блукае па пакутах больш за 50 тысяч інвалідаў. Гэта пакуль нябачны для ўсяго грамадства вялізны архіпелаг".

Сёння нямала ў нас і такіх, якія што ёсць сілы лямантуюць пра імперскія апетыты Расіі. Між тым былыя "каланізатары", як гэта ні дзіўна, клапаціліся пра эканамічны росквіт нашай рэспублікі і ў даваенныя гады, і асабліва пасля Вялікай Айчыннай, калі Беларусь была зруйнавана фашыстамі. Мы ганарымся тым, што ўраджэнцы Беларусі адныя з першых пачалі штурмаваць касмічныя прасторы, а зараз працуюць на адказных пасадах у Расійскай Федэрацыі, у сферах, звязаных з далейшым развіццём касманаўтыкі. Высокую ацэнку расійскай грамадскасці атрымала творчасць многіх нашых пісьменнікаў, мастакоў. Нямала беларусаў у органах дзяржаўнай улады Расійскай Федэрацыі. Амаль кожны з нас мае родных, знаёмых, якія жывуць і працуюць у Расіі, але ніхто іх там не папракае тым, што яны беларусы, не лічыць людзьмі другога сорту.

Многія зараз робяць пагардлівую грымасу, калі чуюць выраз "савецкі патрыятызм". А ці варта ім пагарджаць? Пагарджаць такімі паняццямі, як "савецкі народ", "савецкі характар"? Савецкі патрыятызм у першую чаргу звязаны з дружбай народаў былога Саюза, з іх узаемадапамогай, асабліва ў гады цяжкіх выпрабаванняў. І цяпер, калі рыхтуемся да 50-годдзя вызвалення нашай рэспублікі ад фашысцкіх акупантаў, варта нізка пакланіцца савецкаму чалавеку, савецкаму воіну. Грэх будзе, калі не ўспомнім выдатнае апавяданне Міхаіла Шолахава "Лёс чалавека". Не трэба забываць, што перад мужнасцю савецкага чалавека схіляў часам галаву нават вораг.

Як губляем інтэрнацыяналізм, так можам страціць і нацыянальны гонар, нацыянальную годнасць. Колькі ахвотнікаў з'явілася зараз, якія бяруцца павучаць нас, як ісці да рынку, як будаваць армію. Далей — больш: нам ужо раяць, якую сістэму духоўных каштоўнасцей трэба мець. На першым месцы ў гэтай сістэме — махровы індывідуалізм, пакланенне залатому цяльцу.

Беларуская інтэлігенцыя заклапочана нацыянальным адраджэннем, пераадоленнем вынікаў русіфікатарства ў мове і культуры, а на беларускага гледача з экранаў дзяржаўнага, зазначым, тэлебачання абрушваецца мэтанакіраваная, нахабная амерыканізацыя. Іх фільмы, іх музыка, іх тавары, якія прапагандуе надакучлівая, абрыдлая рэклама. Ды толькі тавары гэтыя ў большасці сваёй нізкаякасныя, прызначаныя менавіта для краін 3-га свету: маўляў, дзікуны ўсё праглынуць за малінку. Ну а што да культуры, мастацтва, дык няўжо ж руская культура, культура Пушкіна, Талстога, Чэхава, Чайкоўскага, Глінкі, Скрабіна ніжэй за амерыканскую, тым больш за так званую масавую?

Усіх, хто адважыцца сёння сказаць нешта добрае пра мінулы перыяд, ваяўнічыя радыкал-дэмакраты зараз жа абвінавацяць у настальгіі па камунізму? Адкуль жа настальгія? Не, не ўсім тады жылося добра, але не жылося так дрэнна, як зараз. Будзем шчырымі: камунізм мог быць марай, ідэалам для мільёнаў людзей. Ці можа стаць марай капіталізм, што нясе бяду большасці? Ці можа натхніць думка аб тым, што ўсё можна купіць і прадаць, да якой нечакана, раптоўна падвялі сённяшняе маладое пакаленне? Ці можа быць ідэалам у выхаванні моладзі халуйства ў адносінах да долара?

Сёння долар пусціўся ў трыумфальнае шэсце па былому Савецкаму Саюзу. Крочыць смела, упэўнена, як гаспадар. Мне могуць нагадаць, што долар з'яўляецца разменным міжнародным грашовым знакам і не вінаваты ён ва ўсіх сумных з'явах, што адбываюцца ў нашым жыцці. Гэта так. Але я супраць таго, каб праз долар чалавек трапляў у духоўную кабалу, губляў сваю годнасць, прывучаўся да нізкапаклонства,каб толькі ў валюце бачылі людзі сэнс жыцця.

У здаровага чалавека сэрца б'ецца рытмічна, як гадзіннік. Хворыя часта скардзяцца на арытмію, якую цяжка вылечыць. А як вылечыць ад арытміі ўсю краіну? Мы не знойдзем адказу на гэта пытанне ў новай Канстытуцыі. І ўсё ж хочацца спадзявацца, што з цягам часу яна стане надзейным компасам у нашым жыцці. Давайце ж шукаць надзейнага капітана, які б добрасумленна і прафесійна карыстаўся гэтым компасам і вёў наш карабель у патрэбным накірунку.

Уладзімір Хоміч, г. Брэст, інвалід ІІ-й групы, кандыдат філасофскіх навук

Ці патрэбна сёння казка?

Мясцовыя ўлады г. Брэста, як бывае ў нас, доўга вагаліся, перш чым вырашыць: ці патрэбен гораду лячэбна-рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей, хворых ДЦП? Аж два гады.

Праўда, заснавальнікі цэнтра — гарадское праўленне таварыства інвалідаў і абласны камітэт Чырвонага Крыжа, як кажуць, "не спалі ў шапку". Хоць і паволі, але дзейнічалі — не дзеля грошай і славы, а дзеля хворых дзетак, дзеля іх гаротных бацькоў.

Спачатку ў дзіцячым садку на ахвяраванні добрых людзей арандавалі некалькі пакояў. За справу ўзялася дзіцячы ўрач-неўрапатолаг Ларыса Мікалаеўна Багдановіч — па свайму ўласнаму жаданню. Бо вельмі ўжо блізкі былі ёй гэты дзіцячы боль, бацькоўскія пакуты.

Задачу перад сабой Ларыса Мікалаеўна паставіла не простую: лячэнне дзетак, дашкольнае выхаванне, рэабілітацыйнае медыцынска-бытавое абслугоўванне. Многія казалі тады Л. М. Багдановіч: хіба гэта магчыма?!

І вось мінула два гады. Лячэбна-рэабілітацыйны цэнтр "Тонус" выжыў, вытрымаў усе выпрабаванні. Зараз тут каля ста дзетак праходзяць поўны курс лячэння. Складае ён два з паловай гады, улічваючы невялікія перапынкі. За гэты час па-чалавечы могуць адпачыць і іх бацькі. А прымаюць сюды дзетак аж да 18-гадовага ўзросту.

Для многіх гэты цэнтр — апошняя надзея. Паверылі ў жыццё, у казку і хворыя дзеткі. Паверылі ў яе і тыя, ад каго залежала: быць ці не быць цэнтру. А як жа інакш?

Нядаўна лячэбна-рэабілітацыйны цэнтр "Тонус" афіцыйна зарэгістраваны ў Брэсцкім гарвыканкаме.

Ж. Уласава

ЭТО ИНТЕРЕСНО

Хотите автостарушку?

Слепой отдаст последнюю рубашку за собаку-поводыря, а для безногого, инвалида с нарушением опорно-двигательного аппарата машина — никак не роскошь. Раньше они, простояв в очереди, пусть долгой, могли получить тот же "Запорожец". Теперь, по существу, можно рассчитывать только на себя. Государство обнищало, оно не в силах позаботиться о своих гражданах.

Конечно, купить сегодня "Жигули" или даже "Запорожец" редко кто из инвалидов может. Новенькие "Жигули" стоят теперь больше шести тысяч долларов, а это, как минимум, сто миллионов. И эти авто редко кто берет, хотя ежедневно звучит реклама по радио, газеты печатают объявления. Берите, люди добрые, — цены дешевле рыночных. Но люди добрые (и плохие тоже) предпочитают старые иномарки. Мой знакомый купил "Мерседес" (само собой не первой молодости, но в неплохом состоянии) всего лишь за пятьсот марок. Топливо дизельное. Не стоит в очереди за бензином. Впрочем, и дизтопливо не спешит покупать на заправках. Покажет бутылку и почти любой тракторист поможет дозаправиться. По этому поводу он особенно не комплексует: мол, мораль моралью, а жить надо. И таких сегодня — тысячи. Не всем, конечно, везет так с покупкой, но за две тысячи долларов можно приобрести (даже в Минске, не надо ехать за границу) довольно приличную иномарку. И даже на дизтопливе! Уже подсчитано, что каждая третья легковая машина в Минске —иномарка. Как правило, это автостарушки. На новых "мерседесах" и "ситронах" ездят исключительно директора крупных коммерческих предприятий. Цена таких машин бешеная — около тридцати тысяч долларов.

Так как же быть инвалиду, который без машины вынужден сидеть в четырех стенах? "Жигули" он, как мы уже отмечали, не купит, новую иномарку тоже. Остаются автостарушки из Польши, Голландии, Германии... Что грех таить, далеко не каждый наскребет две тысячи долларов. Но кое-кто умудряется: помогут дети, продаст вещи, включая обручальное кольцо, мебель, посуду, приобретенные еще при Советах... И покупают!

Недавно (случай свел) познакомился я с одним перегонщиком автомобилей. К сожалению, фамилии его назвать не могу, дал слово молчать, иначе разговора не получилось бы. Думаю, нашему читателю будет небезынтересно узнать, как попадают в нашу республику иномарки, а может быть, кто-либо воспользуется советами профессионального перегонщика.

Федору — тридцать пять лет. Служил в Афганистане. Владеет приемами самбо и карате, его не запугаешь ножом. Боится только огнестрельного оружия. В школе учился средне, но немецкий и польский языки на бытовом уровне знает. Обоятелен.

— После Афганистана работал на стройке каменщиком. Сплошные простои. Ребята пьянствуют, их устраивает любой заработок. Народ неприхотливый, — разоткровенничался он, — а мне не по душе это. Я не собирался пить "чернило" и закусывать крапивой с хлебом. Поступил на водительские курсы. Сначала любительские права получил, а там и профессионала. Как-то знакомый предложил помочь пригнать с Германии машину, ну я и согласился.

Федору сделали заграничный паспорт, визу, и он поехал в Германию вместе с друзьями. Обошлось без приключений. Пригнали три машины. Купить удалось по дешевке. Заплатили ему ...500 долларов. И это за неделю, когда на стройке за такие деньги надо "пахать" месяцев семь.

— И все так просто? — спросил я. — Поехал, купил, возвратился?

Федор улыбнулся.

— Так и быть, поделюсь опытом. Пользуйся, денег не беру. Машин старых в Германии море, на всех хватит. Первый совет: не покупай "тачки" в Берлине, Дюссельдорфе. Здесь, как правило, продают их перекупщики: русские, поляки, наши земляки. Они за каждый пфенниг готовы глотку перегрызть. Приобретают их в глубинке Германии, везут ближе к Польше. Конечно, наводят лоск, а так это — "гробы". Езжайте в глубинку. Осмотрите весь рынок. Узнавайте цены, состояние машины, ее автопробег, год выпуска. Лучше не брать машин, снятых с учета, иначе остановит полиция, отберет...

Мой знакомый закурил, потом продолжал:

— Второй совет — не менее ценный. Запасайтесь горючим в Германии, через Польшу стрелой надо пролететь. Не желаю и врагу ночевать на стоянках и автозаправках. Там рекетиры, как правило, угрожая оружием, собирают дань по триста, а то и больше долларов с машины. Даже если полиция Польши останавливает ночью машину, не тормози — они жадные, не погонятся за вами, жалеют тратить горючее. Едва не забыл, купляй машину не у перекупщика, а у немца. Они часто спешат сбыть старье за бесценок.

— Приходилось ли тебе попадать в переделки?

— Было дело. Один раз откупился: ехал как-никак один. Второй раз остановили группу машин. Начались переговоры, но мы по рации (была у нас) вызвали полицию и все обошлось. А так в Польше я не останавливаюсь. На всякий случай держу сотню-другую долларов в кармане. Не хочется отправляться на тот свет, жизнь не так уж плоха.

— И если не секрет, то сколько ты получаешь за свою работу?

— 15 — 20 процентов от стоимости машины. Так я и признаюсь своим хозяевам, сколько заплатил в самом деле. Привру, конечно. Знает об этом начальство, но помалкивает. Так что тысяча долларов в месяц выходит. Только вот жена недовольна, переживает — молодая, а поседела. Даже дочь нервная, беспокоится. Видимо, скоплю капитал и свою контору открою. Пусть другие рискуют.

Вот такая необычная встреча с необычным человеком. Я, например, уже полгода не езжу на своем "Жигуленке": очень дорогие бензин, запчасти, да и ставить негде. Загнал в деревню, где когда-то с отцом построил гараж, и стоит мое авто до лучших времен. А иногда так хочется прокатиться с ветерком. Приходит в голову шальная мысль, а может быть, продать к черту "Жигули", скопить деньжат на автостарушку. Заманчиво. Как-никак топливо дизельное, вид шикарный. И Федор посоветовал: "Держись "Жигулей", иномарка хороша до поры до времени. Побьешь лобовое стекло, скажем, или крыло ударишь, где новое достанешь? Вылетишь в трубу!"

Вот и думай, автолюбитель: роскошь машина или средство передвижения.

В. Багун

ФОТАІНФАРМАЦЫЯ

Цікава прайшло фізкультурна-спартыўнае свята жыхароў Фрунзенскага раёна Мінска. На яго былі запрошаны ветэраны вайны і працы, перад якімі моладзь прадэманстравала свае спартыўнае майстэрства.

На здымках: сярод удзельнікаў свята ўдзельніцы вайны Клаўдзія Іванаўна Бацюкова, Софія Самойлаўна Ваганава, Зінаіда Іванаўна Качаноўская; у спаборніцтвах шахматыстаў прынялі ўдзел аматары розных узростаў.

Фота Яўгена Пясецкага





Детский санаторий

Есть в Калининградской области Российской Федерации, бывшей Восточной Пруссии, небольшой городок Зеленоградск, почти на границе с Польшей. Волею судьбы без малого двадцать восемь (с ума сойти, уже двадцать восемь!) лет назад встретились в тамошнем детском санатории с непритязательным названием "Зеленоградск -2" тринадцати-четырнадцати-пятнадцатилетние девочки и мальчики. Встретились робкие, настороженные, но, в общем, безмятежные, как все дети.

Тихо опадали в санаторском парке яркие клёны, сеялся, накрапывал, как скоро выяснилось, присущий этому времени прибалтийский мелкий дождик, где-то неподалеку неуловимо дышало стынущее море. Но... минул октябрь, за ним ноябрь, декабрь. А в январе уезжали оттуда многие, не по — детски горько рыдая или как-то по-особому, потрясенно, замкнувшись в своём молчании. Они увозили с собой первую настоящую разлуку. Первую — на всю жизнь.

Не в первый раз, и год от года все с большей отрадой, думаю я о том, что же произошло с нами, и со мною в том числе, в то непередаваемое время. И первое, что ощущаю снова и снова, это — любовь, даже не любовь — влюбленность. Такую чистую, нежную, трепетную, какой, право, больше нигде и ни у кого не бывало.

Было, разумеется, много всего за эти три месяца: и учеба в одной из городских школ, и лечебные процедуры (профиль санатория — заболевание опорно-двигательного аппарата), и долгие поиски янтаря на берегу послештормового моря, и кино в санаторском клубе, и украшение к праздникам игровых комнат (они же столовые), и дни рождения, и КВН, и ежевечерние телебдения... Но, все это, создавая приподнятое чувство нашей полноценности, казалось, служило одному только поддержанию благодатных условий для прорастания и взращивания зародившихся в нас чувств.

Не думаю, чтобы мы слишком отличались от своих здоровых сверстников. А может, и отличались. Это в своей среде мы не придавали серьезного значения своим и чужим недугам, не позволяли им сказываться на взаимоотношениях. Но гораздо существеннее было то, что тогда дети еще не стали этакими всезнайками — вундеркиндами или запрограммированными на успех суперменами, какими принято изображать последующие поколения подростков — акселератов, не говоря уже о нынешнем, "выбравшем пепси".

Нет, как все в ту пору, мы были идеалистами и романтиками, только в силу своей "сверхопекаемости" отличались, видимо, еще большей наивностью и болезненноранимой чуткостью. Естественно, что при этом редко у кого не было испытанного убеждения в том, что немыслимо жить без честности, доброты, справедливости и затаенно-острого чувства собственного достоинства. На этот счет болезнь дает особый опыт.

Прибавьте к этому еще безоглядную доверчивость и открытость характеров, навязчивое в ранней юности желание встретить свое второе "я", жажда совершенного, утонченного понимания и возвышенного чувствования, неподавленное свойство идеализации и самозабвения. Наконец, то обстоятельство, что почти все мы впервые оказались надолго в тесном и многолюдном "общежитии" в кругу сверстников и сверстниц, одновременно интимном и защищающем внутреннюю свободу каждого. В итоге между обитателями обособленного от всего мира здания детского санатория, похожего на опрокинутый кверху килем корабль, не могли ни возникнуть редкостные по накалу взаимоотношения.

Не знаю, кого первого посетил колдовской дух влюбленности, но после октябрьских праздников ее чары коснулись едва ли не всех. Временами казалось, какая-то эпидемия охватила нас. Так в насыщенной влагой атмосфере достаточно образоваться одной капле, чтобы хлынул ливень. Влюблялись в поворот головы, выражение глаз, жест, голос, смех, имя, походку... Более того, кое-кто влюблялся на неделе не по одному разу или даже в два-три "предмета" одновременно. А какой отелловской ревностью, какими шекспировскими страстями и трагедиями это сопровождалось!

Нетрудно представить, каким опытом пошлости и безнравственности могло бы обернуться это в нынешнее расхристанное время. Досталось бы и воспитателям, наверное (куда смотрели!). Но шел 1966-й год. И опыт первой любви выявил не падение, а такое возвышение юных душ, с какого обычно и начинается осознание человеком себя как личности. Что более свято!

Не случайно я не могу припомнить, чтобы что-то вульгарное сопутствовало нашим отношениям. Поначалу им даже ухаживания и объяснения были не нужны, а первый поцелуй, у кого он был, оказался прощальным.

Это сама атмосфера нашего счастливого "общежития", в которой не было места ни эгоизму, ни самоутверждению за счет другого, позволила находить наиболее полное удовлетворение в одном почти безмолвном обожании. Каждый из нас словно исполнял негласный обет целомудренной чистоты и одухотворенности чувств.

Написалось — каждый и сразу все мы, тогдашние, перед глазами. И не расстававшийся с гитарой озорной ленинградец Валька Остроущенко. И своенравный Володька Ежов из Гусь-Хрустального. И рассудительно-покладистый Виктор Волков из города Ясиноватая. И простодушный, дурашливый Сашка Шворнев из Железногорска. И снисходительно-ироничный, самый старший среди нас, Александр Осипук из Минской области. И неунывающий Вовка Бажин из Орла. И страстный фотограф, бескорыстнейший Сережка Галаков из Вологды. И преданный Сашка Конечный из Архангельска.

Ну и, конечно, девочки. Трогательно-нежная Оля Величко. Рыжеволосая модница Люда Моргунова. Заводная смуглянка Валя Гордличко. Сосредоточенная Таня Козлова. Непоседливая Нина Гайфулина (кстати, приехавшая аж из Кзыл-Орды). Независимая и незаметная Таня Бей — с ней мы сидели в столовке за одним столом. Подозреваю, что она была чуть-чуть неравнодушна ко мне — иначе с чего бы ей постоянно ворчать на меня! Выделялась же тогда смешливая и насмешливая Надя Зуева, в которую одно время были влюблены едва ли не все поголовно и чей облик почему-то стёрся в памяти больше других. Зато запала в душу тихая, доверчивая Зина Лагуцкая, калининградская белорусочка, ставшая спустя двадцать лет моей женой...

Что такого уж необычного в этой незамысловатой истории, в описанных обстоятельствах? Лично для меня — не просто необычность, а исключительность и уникальность их состоит как раз в типичности "зеленоградского детского санатория". У каждого, кто вырос достойным человеком, личностью, было в жизни что-то подобное. Но для меня это еще и характернейшая примета прежнего образа жизни всей нашей бывшей страны, так бездарно, так бессмысленно разрушенного в последнее десятилетие.

Я не сторонник прямолинейных умозаключений, но жизнь, которая так часто, так легко позволяла тяжелобольным детям не чувствовать своей обездоленности, такая жизнь не могла ни иметь под собой здоровой гуманистической основы. Для нас, похоже, единственно возможной основы. Поэтому нынешний процесс самоуничтожения, судя по всему, не прекратится до тех пор, пока мы не восстановим ее, по-новому укрепившуюся и очистившуюся от многого наносного и чужеродного.

Анатолий Кузьмин

Пасеяны градкі, дагледжаны сад

Іван Васільевіч Марцінчык пражывае ў звычайным драўляным доме з чырвонай зорачкай па вуліцы Камсамольскай. Невялікі прысядзібны ўчастак, што акружае дом і надворныя пабудовы, у поўным парадку: пасаджана бульба, пасеяны градкі, дагледжаны сад. Тры гады як памерла жонка. І ён, 83-гадовы чалавек, інвалід другой групы па зроку, яшчэ рухавы: штосьці дома зробіць па гаспадарцы, прыбярэ ў пакоях, сходзіць у магазін за прадуктамі. Жыве з бацькам сын Аляксандр, рабочы райаграпромтэхнікі. Ён бярэ на сябе вялікую ношу па гаспадарцы і ўходу за састарэлым бацькам. Калінікалі прыязджаюць наведаць і дапамагчы сын Міхаіл і дачка Валянціна. Ды і хіба наездзішся цяпер, калі такія дарагія білеты на транспарт?

Іван Васільевіч — чалавек бывалы, таварыскі, гаваркі. Ён рады кожнаму чалавеку, што завітае да яго ў хату, любіць падзяліцца перажытым. Вось і завітаў я на днях да І. В. Марцінчыка, пацікавіўся жыццём-быццём і папрасіў успомніць гады маладосці, крылы якіх абпаліла нялёгкае жыццё і страшэнныя выпрабаванні ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Слухаю нетаропкі расказ Івана Васільевіча. Нарадзіўся і вырас у вёсцы Чурылава ў 1911 годзе ў беднай шматдзетнай сям'і, разам з іншымі братамі і сёстрамі дапамагаў бацькам. А калі ў роднай вёсцы ў 1930 годзе ўтварыўся калгас "Чырвоны барацьбіт", адзін з першых уступіў у яго ў ліку 12 аднавяскоўцаў. Праз тры гады быў прызваны на службу ў Чырвоную Армію. Вось так трапіў на Далёкі Усход. Непаўторнасць, хараство тутэйшай прыроды вельмі паразілі юнака. Разам з іншымі салдатамі-будбатаўцамі выконвалі прыказ ваеннага начальства па ўзвядзенню велізарнага драўлянага масцта стратэгічнага прызначэння праз сібірскую раку Хор. Цяжкая, вельмі цяжкая была гэтая будоўля. Мяцеліца. Марозы. А яны дзень і ноч на санях, запражаных коньмі, дастаўлялі лесаматэрыялы на будоўлю за многія дзесяткі кіламетраў, начавалі ў палатках.



І вось наступіў 1936 год — час дэмабілізацыі. Вярнуўся ў родныя мясціны, па рэкамендацыі райкома камсамола атрымаў накіраванне на службу ў аддзел міліцыі г. п. Узда. А затым яго камандаванне накіравала на вучобу на два гады ў Мінскую школу міліцыі імя М. В. Фрунзе, дзе і захапіла Вялікая Айчынная вайна. У першыя дні бамбардзіроўкі горада Мінска прыйшлося пераехаць у г. Віцебск.

— Пры наступленні гітлераўцаў адразу ж быў арганізаваны батальён міліцыі, — апавядае Іван Васільевіч. — Адбівалі напады ворага. Бой быў няроўны: давялося адступаць на Усход. Вось так і трапілі ў Маскву. Добра памятаю, як па загаду Міністэрства ўнутраных спраў СССР ад 9 студзеня 1942 года разам з іншымі калегамі атрымалі накіраванне ў блакадны Ленінград. Перапраўляліся праз замёрзлае Ладажскае возера. Шосты аддзел МУС у гэты цяжкі час абараняў горад ад ворага, работнікі міліцыі патрулявалі на вуліцах, аказвалі дапамогу галадаючым і знясіленым людзям у часы налётаў, бамбардзіровак і артабстрэлаў. Дапамагалі насельніцтву хутчэй схавацца ў бомбасховішчы. Балюча было глядзець на хворых, галодных людзей. Запомніліся такія выпадкі: у даўжэзнай чарзе за кавалачкам хлеба стаяць дзеці, старыя. Выбежыць, бывае, падлетак, вырве ў старога ці нямоглага акраец яго і адразу ў рот. Есці ўсім хацелася. Людзі ад голаду паміралі, як мухі. Міліцыянеры збіралі па вуліцах, дамах і кватэрах памёршых, на спецмашынах вывозілі на Піскароўскія могілкі. А там па 50 чалавек выкопвалі магілы па 2 метры шырынёй і даўжынёй 500 метраў. Колькі ні ў чым не павінных людзей вось так памерла ад голаду, нават страх думаць.

Вось так тры гады трывожных дзён і бяссонных начэй правёў ветэран у блакадным Ленінградзе, які не пакарыўся ворагу. З ардэнамі Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга, медалём "За абарону Ленінграда" вярнуўся Іван Васільевіч Марцінчык на родную Уздзеншчыну. З дня перамогі да 1961 года служыў участковым міліцыянерам у раённым аддзеле ўнутраных спраў. І цяпер, калі ветэран вайны і працы даўно ўжо на заслужаным адпачынку, нярэдка завітае ў аддзел, цікавіцца, як працуецца яго супрацоўнікам.

Міхаіл Булат

На здымку: *І. В. Марцінчык*

Фота аўтара

ВЕСТКІ З ПРАВІНЦЫІ

Дапамога вучняў

Калі хто з нас захварэе, мы выклікаем па тэлефоне "хуткую дапамогу". А што рабіць тым, каго не так даймаюць хваробы, як старасць, знямогласць, адзінота. Калі такі пенсіянер жыве ў вёсцы Турэц-Баяры Маладзечанскага раёна, дык ён звяртаецца ў мясцовую сярэднюю школу, бо менавіта там напярэдадні Свята Перамогі і 50-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вырашылі правесці аперацыю пад назвай "03".

Спярша настаўнікі наведалі адзінокіх пенсіянераў і прапанавалі ім свае паслугі, а потым і вучні пачалі дапамагаць адзінокім і нямоглым людзям. Хлопцы з 11 "б" класа вычарпалі ваду са склепа бабулі С.І. Ігнатовіч, шасцікласніцы Ксеня Шурпік, Лена Рудая навялі парадак у адзінокай пенсіянеркі Я. Н. Лаўрэнцьевай, дзесяцікласнікі Сяргей Матусевіч і Юра Чарняўскі напілавалі дроў састарэлай М. М. Бельскай.

Такая дапамога вучняў школы адзінокім пенсіянерам — аднавяскоўцам стала тут традыцыйнай.

Узводзіцца помнік

